*Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зборнік навуковых прац / Пад рэд. А. М. Янушкевіча. Мінск, 2014.*

*Андрэй Янушкевіч*

# Да праблемы нефармальных кантактаў магнатаў Вялікага княства Літоўскага ў дыпламатычных зносінах з Маскоўскай дзяржавай у другой палове XVI ст.

Нефармальныя кантакты дыпламатаў заўсёды адыгрывалі важную і прыкметную ролю ў знешнепалітычнай дзейнасці. Часта кантакты на нефармальным узроўні дазвалялі знайсці ўзаемапаразуменне і прыйсці да кампрамісу па складаных і супярэчлівых пытаннях, альбо – пры мінімальным выніку – вызначыць сапраўдныя матывы дзеяння і мэты другога боку ў перамовах.

Падобнага роду кантакты часта застаюцца няўлоўнымі для даследчыка, бо крыніцы, як правіла, пакідаюць нам сведчанні толькі аб афіцыйным баку перамоўнага працэсу. Таму любая інфармацыя пра стасункі па-за межамі фармальнага пратаколу, адыход ад прынятых нормаў на карысць усталявання прамой камунікацыі з’яўляецца вельмі каштоўнай.

У гісторыі ўзаемаадносін Вялікага княства Літоўскага з суседзямі, асабліва з Вялікім княствам Маскоўскім (Маскоўскай дзяржавай) і Крымскім ханствам, захавалася нямала цікавых старонак, якія дазваляюць заглянуць за шырму афіцыйных перамоў, убачыць закулісную гульню дыпламатаў, прасачыць іх рэакцыю на нечаканыя павароты ў сцэнарыі дыпламатычных мерапрыемстваў. Тут асабліва шмат інфармацыі даюць маскоўскія пасольскія кнігі, у якіх скрупулёзна занатоўваліся самыя дробныя дэталі перамоў. Аднак нямала цікавых фактаў і сведчанняў «падкідваюць» нам і крыніцы з літоўскага боку, хоць такім вялікім аб’ёмам інфармацыі як маскоўскія пахваліцца яны не могуць.

Важна адрозніваць нефармальныя кантакты ад неафіцыйных. Пад неафіцыйнымі маюцца на ўвазе перадусім санкцыянаваныя «зверху» дыпламатычныя місіі і перамовы ад імя радных паноў ВКЛ і маскоўскіх

© А. Янушкевіч

баяр (альбо – віленскага каталіцкага біскупа як галавы гаспадарскай Рады і маскоўскага мітрапаліта). афіцыйны характар маглі мець толькі ганецкія і пасольскія місіі з «лістамі» альбо «глейтамі» («веручымі лістамі», «опасными грамотами») ад манарха, бо толькі ён з'яўляўся адзіным сюзерэнам улады, аб'ектам міжнародных адносін, якія, такім чынам, з фармальнага боку мелі персаніфікаваны характар. Таму ганцы ад прадстаўнікоў кіроўнай эліты (ніякім чынам не паслы!) былі абмежаваныя ў сваіх паўнамоцтвах і, як правіла, падобныя місіі выкарыстоўваліся для зандавання грунту і наладжвання новага раўнду афіцыйных перамоў. Справа ў тым, што для манаршай годнасці лічылася знявагай сыходжанне да прапановы перамоў. Неафіцыйныя кантакты мелі традыцыйную афарбоўку і лічыліся адной з формаў дыпламатычных зносін, калі трэба было выканаць нейкія пасрэдніцкія задачы альбо дасягнуць нетрадыцыйных мэтаў.

У нефармальных жа кантактах дыпламаты імкнуліся пазбавіцца ад афіцыёзу на карысць збліжэння і высвятлення сапраўдных магчымасцяў, паўнамоцтваў для рашэння задач, выпрацоўцы задавальняючага ўсе бакі рашэння паўсталых праблем. Нефармальныя кантакты суправаджаліся фактарам нечаканасці, калі адзін бок часта быў не прыгатаваны да ініцыятывы другога. Пад азначэнне нефармальных перамоў добра пасуе вызначэнне канфідэнцыяльнасці, кулуарнасці.

Пасля дэталёвага аналізу дыпламатычных зносін мы прыйшлі да высновы, што нефармальнасць у дыпламатычных кантактах вызначаецца перадусім у наступных рысах:

- нечаканасць ініцыятывы кантакту;
- непрадугледжанасць формы кантакту пратаколам і традыцыяй;
- выхад дыскусіі за стандартныя, агульнапрынятыя рамкі;
- сакрэтнасць перамоў;
- нестандартнасць месца і формы і ўвасаблення кантакту;
- нярэдка – характар прыватнай ініцыятывы.

Адзначым, што неабавязкова ўсе гэтыя чыннікі павінны ўвасабляцца разам, часта толькі прысутнасць некаторых з іх указвае на нефармальны характар камунікацыі. Так ці інакш, трэба падыходзіць да той ці іншай падзеі ў комплексе, разглядаючы яе як цэласную з'яву.

У якіх дзеяннях праяўляліся нефармальныя кантакты дыпламатаў? У першую чаргу яны ўвасабляліся ў правядзенні канфідэнцыяльных перамоў, нефармальных размовах («бяседах») дыпламатаў з прыставамі і людзьмі з абслугоўваючага персаналу, рэзанансных паводзінаў дыпламатаў, якія разыходзіліся з традыцыйнымі нормамі і практыкай, у некаторых выпадках – у ажыццяўленні пэўных нестандартных захадаў і

ініцыятыў, аб чым распавядзем ніжэй.

Нейкай абсалютнай заканамернасці ў пераходзе да нефармальных дыпламатычных кантактаў не знойдзеш. Яны мелі месца, калі паўставала такая патрэба, прытым выклікаць яе маглі самыя разнастайныя акалічнасці. Аднак добра відаць, што пры сутыкненні інтарэсаў, абвастрэнні становішча вакол пэўных спрэчных пытанняў імкненне знайсці слушнае і задавальняючае рашэнне штурхала да пошуку інакшых формаў камунікацыі, непрынятых у афіцыйным дыпламатычным пратаколе.

Нядзіўна, што найбольш інтэнсіўныя нефармальныя кантакты мы назіраем ў 1558–1560 гг., калі разгараўся канфлікт вакол Інфлянтаў, які ў рэшце рэшт перарос у шырокамаштабную вайну. Гэта было звязана з актывізацыяй ВКЛ на міжнароднай арэне, што выяўлялася перадусім у жаданні атрымаць кантроль над тэрыторыяй Усходняй Прыбалтыкі і адначасовым жаданнем захаваць мірныя стасункі з усходнім суседам – Маскоўскай дзяржавай.

Да нефармальных спосабаў камунікацыі звярталіся зусім не тады, калі афіцыйныя, дазволеныя дыпламатычныя сродкі і метады былі вычарпаныя, а калі іх бракавала для вылучэння і афармлення прапаноў і ініцыятыў. Здаралася, што закрытасць пасольства, немагчымасць выклікаць паслоў на кантакт расцэньвалася як кепскі знак і трактавалася як прыкмета няўдалага ходу перамоў. Гэта добра адчуваецца па «Размове» пасла Стэфана Збаражскага 1556 г.[1] Маскоўскія пасольскія кнігі не занатавалі якіх-кольвек значных пікантных падрабязнасцяў пра ход пасольства[2].

І яшчэ адзін важны момант – здараліся выпадкі, калі паслы спрабавалі «граць» уласную гульню на дыпламатычным полі. Цікавыя здарэнні па дарозе пасольства ВКЛ у Маскву ў 1553 г. занатавала маскоўскай пасольская кніга, якія з поўным правам можна расцэньваць як гульню ў асабістых інтарэсах пасла.

Старшы пасол, полацкі ваявода Станіслаў Давойна паспрабаваў праз свайго служэбніка Паўла Казіцкага навязаць кантакт з маскоўскімі

[1] Сборник князя Оболенского. Кн. 5. М., 1838. Больш падрабязна пра пасольства С. Збаражскага і гэтую крыніцу яго аўтарства гл.: Янушкевіч А. М. Пасольства Стафана Збаражскага 1556 года ў Маскву // Беларускі гістарычны часопіс. 2012. № 3. С. 21–28.

[2] Сборник императорского Русского исторического общества (далей – СИРИО). Т. 59: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. Т. II: 1533–1560 гг. / Ред. Г. Ф. Карпов. СПб., 1887. С. 478–516.

прыставамі. Для нас важна, што сам ён на такі кантакт не мог пайсці, бо быў пастаянна «с товарищами[3]». Каго меў на ўвазе полацкі ваявода, які сам сябе прадстаўляў як чалавека з «украіны», з памежжа? Не сумняваемся, што гэта перадусім людзі з цэнтру, з Вільні – гаспадарскі маршалак і пісар Астафій Валовіч і гаспадарскі пісар Пётр Сямашка, якія былі адпаведна сярэднім і малодшым паслом.

Праз пасрэдніка С. Давойна заявіў, што гатовы выканаць любую волю маскоўскага цара. Яго меркаванне як старшага пасла будзе апошнім пры вызначэнні рашэння літоўскага пасольства. Цікава, што перад гэтым, падчас прыёму ежы, дзе паслы пачалі маскоўскіх прыставаў «подпивати», полацкі ваявода ўголас заявіў, што дадому без падпісанага міру не паедзе[4].

Ініцыятыва С. Давойны не атрымала свайго працягу на афіцыйных перамовах у Маскве. Цяжка сказаць, ці быў у яго сапраўды ўласны план па завяршэнні перамоў, ці гэта быў хітрадумны крок, якім літвіны хацелі пусціць пыл у вочы маскоўцам, абнадзеіўшы на спрыяльны для іх зыход перамоў. Забягаючы наперад, адзначым, што С. Давойна ніколі не абвінавачваўся ў сімпатыях (тым больш, у здрадзе) да Маскоўскай дзяржавы, нават нягледзячы на факт кіравання ім няўдалай абаронай Полацка ў 1563 г. Так ці інакш, сам характар кароткай размовы пасла з прыставамі сведчыць пра неардынарнасць нефармальных захадаў літоўскіх дыпламатаў.

Можна прасачыць яшчэ адну выразную тэндэнцыю, калі за прыватнай ініцыятывай хаваўся важны агульнадзяржаўны змест. У перыяд разгортвання інфлянцкага канфлікту надзвычай цікавай з'явай у канфідэнцыяльных кантактах паміж літвінамі і маскоўцамі стала акцэнтаванне літоўскімі палітыкамі прыналежнасці да праваслаўнага веравызнання. На нашу думку, можна нават казаць аб феномене «праваслаўнай дыпламатыі», калі рэлігійны чыннік браўся ў якасці апоры для зандавання грунту, аргументацыі і пошуку агульных кропак для ўзаемапаразумення. Найбольш яскрава падобным метадам наладжвання сувязяў з маскоўскімі палітыкамі вызначыўся ў канцы 50-х – пачатку 60-х XVI ст. А. Валовіч.

У лютым 1558 г. Вільню нечакана наведаў маскоўскі пасланнік Раман Алфер'еў. Яго справаздача насычана надзвычай цікавымі сакавітымі фактамі. Шмат увагі надавалася канфідэнцыяльным размовам пасланніка з вядучымі літоўскімі палітыкамі.

[3] Тамсама. С. 384–385.
[4] Тамсама. С. 384.

У першай канфідэнцыяльнай сустрэчы А. Валовіч спачатку разам з іншымі высокімі ўраднікамі (кн. Васілём Астрожскім, кн. Стэфанам Збаражскім і Янам Шымковічам) адобрыў ідэю антыкрымскага саюза на падставе цвёрдага замірэння. Аднак відавочна, што падобнае абмеркаванне было прыкрыццём для арганізацыі спаткання з канцлерам і віленскім ваяводай М. Радзівілам Чорным. Ён указаў на пагрозу ўмяшальніцтва Асманскай імперыі: «изгонити его (крымскага хана – *А.Я.*) не хитро таким государем, да надобет правда – турской у государя нашего в суседех». Бянтэжылі Радзівіла і актыўныя дзеянні на Украіне перабегшага на бок маскоўцаў Дзмітрыя Вішнявецкага ў варунках дзеяння перамір'я: «то государя правда ли – с государем нашим в миру, а на государя нашего земле велит Вишневетцкому городы ставити»[5].

Цікава, што літоўскія прыставы пры маскоўскім пасланніку распускалі чуткі аб жорсткім палітычным супрацьстаянні М. Радзівіла Чорнага са сваім стрыечным братам троцкім ваяводай, найвышэйшым гетманам М. Радзівілам Рудым і віленскім кашталянам, жамойцкім старостай Геранімам Хадкевічам: «бранятца смертною бранью и заповедали на битву», а грамадская думка ў ВКЛ была яўна не на баку першага са свецкіх радных паноў[6].

Падчас другой, ужо асабістай сустрэчы А. Валовіч паведаміў, што перадаў Жыгімонту Аўгусту, аб чым вялася размова з канцлерам і віленскім ваяводай, адзначыўшы: «и хотят того все, чтобы меж государей был мир вековой»[7].

Вядома, што А. Валовіч звярнуўся праз Р. Алфер'ева да дзяка Пасольскага прыказа І. Віскаватага з упэўніваннем, што ён супраць «лютарскай веры» і прасіў у таго заступніцтва перад Іванам Грозным у выпадку паклёпу на яго асобу: «в их государя царстве учинилось дело злодейское, великое люторство…, и что учнут которое неподелное дело говорити, злодейское люторство, и он в те поры сказывает втайне создателя (…) и слезами ся от тех дел неподобных боронит, и которое слово не по делом великому государю за Остафья порадеть, как бог положит ему на душу, а он тому делу, сказывает, не поделен»[8]. Відавочнай ёсць спроба наладзіць кантакт з уплывовым дзякам, з якім А. Валовіч меў магчымасць пазнаёміцца ў 1553 г. Аднак нельга выключаць, што на такі крок урадніка са старажытнага

5 Тамсама. С. 548.

6 Гл.: Тамсама. С. 549-550.

7 Тамсама. С. 549.

8 Тамсама. С. 550–551.

праваслаўнага роду штурхалі душэўныя перажыванні. Вядома, што ў гэты перыяд ён пачаў калі не схіляцца, то цікавіцца пратэстанцкімі вучэннямі, і цалкам магчыма, што гэты інтарэс да новага веравызання быў выкліканы кар'ерысцкімі матывамі.

Звяртаючыся ў жніўні 1560 г. праз літоўскага ганца Андрэя Станіслававіча Люлю непасрэдна да І. Віскаватага з просьбай апекавацца аб міры паміж дзвюма краінамі, А. Валовіч склаў далікатную просьбу прыватнага характару. А. Валовіч папрасіў пасольскага дзяка перадаць для азнаямлення «Евангельскія бяседы» Іаанна Златавуста. На думку савецкага даследчыка Леаніда Юзэфовіча, Валовіч хацеў гэтым учынкам не проста прадэманстраваць вернасць праваслаўю, але і ўмацаваць грунт для даверлівых кантактаў з маскоўскім уплывовым палітыкам. Ён лічыў, што рэлігійная аснова – найлепшая для нефармальных блізкіх кантактаў[9].

І. Віскаваты заявіў у адказ на словы Валовіча аб хадайніцтве аб міры перад гаспадарамі: «государя своего видим ко всякому добру сходителна, а от вашего государя все на роздор идет»[10]. У гэтым пазіцыя маскоўскага дыпламата была бескампраміснай. У дачыненні да высылкі царкоўных кніг ён паабяцаў зрабіць з іх копіі і даслаць А. Валовічу ў Вільню.

Гэтая просьба аднаго з галоўных экспертаў па дачыненнях з Маскоўскай дзяржавай паказвае, як праз канфідэнцыяльныя кантакты на рэлігійнай глебе ў Вільні спрабавалі перакінуць мост для беспасрэдных кантактаў з магутным маскоўскім дзякам – фактычным кіраўніком Пасольскага прыказа. У нас не выклікае сумнення, што праз інтарэс да праваслаўных кніг з рэлігійным зместам Валовіч, які хоць і меў сімпатыі да пратэстантызму, але паходзіў з праваслаўнага роду, шукаў магчымасці зблізіцца з Віскаватым і праз яго лабіраваць ідэю замірэння дзвюх дзяржаў. Аднак маскоўская дыпламатыя аказалася непадатлівая на камбінацыі літвінаў.

Не менш цікавай у гэтым кантэксце выглядаюць місіі еўгрыпскага мітрапаліта Іасафа і камянец-падольскага манаха Ісайі, якая выклікалі асаблівую цікавасць даследчыкаў. Руслан Скрыннікаў убачыў у апошняй не толькі культурна-асветніцкі, але і выразны палітычна-шпіёнскі змест, яшчэ адну спробу літоўскіх магнатаў схіліць маскоўскія кіроўныя эліты да працягу мірных адносін з ВКЛ[11]. Манаха, які ехаў у Маскву па даручэнні

9 Юзефович Л. А. Миссия Исайи (1561 г.) и Остафий Волович // Советское славяноведение. 1975. № 2. С. 77–78.

10 СИРИО. Т. 59. С. 622.

11 Скрынников Р. Г. Переписка Грозного и Курбского (Парадоксы Эдварда Кинана). Л., 1973. С. 63–64.

А. Валовіча і Р. Хадевіча зняць копіі з шэрагу царкоўных кніг, у тым ліку і «Евангельскіх бясед», спрабавалі выкарыстаць у якасці пасрэдніка для ўсталявання блізкіх кантактаў з маскоўскімі ўраднікамі, у прыватнасці, з тым жа І. Віскаватым. Мітрапаліта Іасафа, у сваю чаргу, падключылі для данясення мірных намераў літоўскай кіроўнай эліты, выкарыстоўваючы яго аўтарытэт як высокага царкоўнага дзеяча, які да таго ж вёз граматы канстантынопальскага патрыярха да Івана Грознага. У Маскве манаха Ісайю абвінавацілі ў ерасі і кінулі ў вязніцу, а еўгрыпскаму мітрапаліту давялося апраўдвацца за свае кантакты з іншаверцамі ў ВКЛ[12].

Літвіны часта матывавалі зварот да нефармальнай камунікацыі патрэбай захаваць свае мірныя ініцыятывы ў сакрэце ад палякаў, якія, маўляў, толькі і думаюць, як паваяваць з маскоўцамі. На самай справе за гэтым акцэнтаваннем уяўнай польскай агрэсіўнасці хавалася жаданне згуляць на кантрасце і схаваць уласныя пацыфісцкія настроі.

На пачатку 1555 г. літвіны пачалі шукаць грунт для заключэння новага перамір'я. У Маскву фармальна ад імя гаспадарскай Рады быў выпраўлены ганец Юры Тышкевіч. 1 лютага 1555 г. адбылася яго размова з маскоўскім мітрапалітам Макарыем. Літоўскі ганец заявіў, што яго як чалавека праваслаўнай веры вельмі непакоіць адсутнасць трывалага міру паміж дзвюма хрысціянскімі краінамі. Ён сцвярджаў, што ў ВКЛ прыхільнікамі міру з'яўляюцца самыя высокія ўраднікі – віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны і земскі падскарбі і наваградскі ваявода Іван Гарнастай. У адрозненне ад Літвы, у Польшчы прагнуць развязаць вайну з маскоўцамі. У такіх абставінах літвіны прапаноўвалі маскоўцам даслаць сваё пасольства ў ВКЛ. Адзначым, што і тут Ю. Тышкевіч невыпадкова згадаў сваё праваслаўнае паходжанне і быў адпраўлены з такой місіяй.

Відавочна, што згадванне «польскай пагрозы» павінна было служыць для маскоўцаў своеасаблівым стымулам, які б заахвоціў іх да перамоў аб заключэнні міру. Аднак прыватны характар слоў Ю. Тышкевіча (ён не прывёз з сабой ніякіх лістоў ад радных паноў) не выклікаў у маскоўцаў поўнага даверу. У «Выпісцы» дабаўлена, што толькі па слядах вуснай прамовы літоўскага ганца «бити челом государю непригоже»[13]. Маскоўскія

[12] Падр. гл.: Юзефович Л. А. Миссия Исайи (1561 г.) и Остафий Волович. С. 73–81; Граля И. Иван Михайлов Висковатый: Карьера государственного деятеля в России XVI в. М., 1994. С. 256–258; Хорошкевич А. Л. Россия в системе международных отношений середины XVI века. М., 2003. С. 276–282.

[13] Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. Т. 2: «Выписка из посольских книг» о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1497–1572 гг. / Под ред. С. О. Шмидта. М. – Варшава, 1997.

баяры запатрабавалі даслання афіцыйных лістоў («присылки») ад віленскага біскупа Паўла Аляксандравіча Гальшанскага і віленскага ваяводы, у якіх была б выкладзена іх пазіцыя.

Прапанова, зробленая ад імя М. Радзівіла Чорнага і А. Валовіча падчас місіі Марціна Валадковіча ў Маскве 25 студзеня 1560 г., заслугоўвае асаблівай увагі. Выказваючы старую думку аб агрэсіўнасці палякаў, якія ў дадзеным выпадку не хочуць трымаць Жыгімонта Аўгуста за караля, калі той не будзе ваяваць з маскоўцамі (sic!), літоўскія палітыкі прапаноўвалі дамовіцца не аб замірэнні, а аб «Ливонской бы земле зговор учинили»[14]. Гаворка, напэўна, ішла аб падзеле сфераў уплываў у Інфлянтах. А. Валовіч ад свайго імя прапанаваў у гэтай небяспечнай накаленай сітуацыі прысласць маскоўскіх паслоў у Вільню, каб дамовіцца аб усіх балючых справах. А канцлер і віленскі ваявода М. Радзівіл Чорны, у сваю чаргу, зробіць усё ад яго залежнае, каб доўгачаканы мір быў заключаны. Цікава, што ў інтэрпрэтацыі А. Валовіча М. Радзівіл Чорны выступае ў вачах палякаў ледзь як не агент Масквы; ён перадаваў неверагодныя чуткі, якія ходзяць па Літве: «ты, воевода, поминки (ад маскоўцаў – *А.Я.*) поймал, русскому государю помогаешь»[15].

Зварот да нефармальнай камунікацыі так ці інакш ставіў ініцыятара падобнага кантакту ў позу «прасіцеля». Радныя паны ВКЛ, з аднаго боку, не мелі вялікіх магчымасцяў падтрымліваць афіцыйныя кантакты, таму звярталіся да неафіцыйных і нефармальных прыёмаў, з іншага ж – іх да гэтага штурхала крайняя настаўленасць на пацыфісцкія паводзіны, імкненне захаваць мірнае становішча ў любым выпадку. Нават удалы збег абставін, калі можна было дыктавацт свае ўмовы, не прымушаў іх пераглядзець погляды на знешнюю палітыку.

Унікальныя падзеі, звязаныя з нефармальным кантактаваннем на дыпламатычным полі, адбыліся падчас візіту маскоўскага пасольства на чале з акольнічым Фёдарам Сукіным у кастрычніку 1560 г.[16] Маскоўцы, прапанаваўшы заключыць дынастычны шлюб Івана Грознага з адной з незамужніх сясцёр Жыгімонта Аўгуста – Ганнай ці Катарынай, прасілі «ударыць ім чалом» і такім чынам фактычна прадставіць жаніха. З гледзішча на патаемны характар перамоў і дыпламатычныя каноны пра-

С. 199–200.

[14] СИРИО. Т. 59. С. 601.

[15] Тамсама.

[16] Падр. гл.: Янушкевіч А. М. Няспраўджаная ідэя дынастычнага шлюбу: маскоўскае пасольства Фёдара Сукіна 1560 года ў Вільню // Беларускі гістарычны часопіс. 2014. № 1. (у друку)

весці падобнае мерапрыемства на афіцыйным узроўні было немагчыма. Замест чалабіцця, у якім было катэгарычна адмоўлена спасылкай на меркаванне Жыгімонта Аўгуста, паслам было прапанавана таемна ўбачыць каралеўнаў пасля нядзельнага святочнага набажэнства[17].

Пагадзіўшыся на літоўскую прапанову, рана ў нядзелю 13 кастрычніка 1560 г. маскоўскія паслы пад'ехалі да касцёла вакольнымі шляхамі і размясціліся насупраць у збройнай палаце («оружейничей избе»). Увесь час побач з імі знаходзіўся гаспадарскі маршалак і пісар Ян Шымковіч. Пасля службы на пляц перад касцёлам выйшлі Жыгімонт Аўгуст з каралевай, поруч з імі знаходзіліся каралеўны Ганна і Катарына. Жыгімонт Аўгуст загаварыў з віленскім ваяводай М. Радзівілам Чорным, які папярэдне загадаў вызваліць пляц ад людзей («учал людей розсылати»)[18].

У дзень ад'езда пасольства на пасольскі падворак завітаў сам А. Валовіч. Ён уручыў паслам «парсуны» (хутчэй за ўсё, невялікія партрэты тыпу медальёнаў) каралеўнаў Ганны і Катарыны, і прасіў паслоў хадайнічаць у лісце, які будзе дасланы наперад пасольства са спецыяльным ганцом, каб Іван Грозны вывеў свае войска з Інфлянтаў. Іх прысутнасць, па яго словах, перашкаджала наладжванню канструктыўных зносін паміж абедзвюма краінамі і як мага хутчэйшаму высланню пасольства ВКЛ для заключэння шлюбу.

Хто ж мог стаяць за падобнай авантурнай і нябачанай раней ініцыятывай? На наш погляд, за ёю хаваліся тыя з радных паноў, якія бачылі ў замірэнні з Вялікім княствам Маскоўскім адзіны выхад са складанага становішча на міжнароднай арэне, якое ўзнікла з-за разгортвання ўзброенага канфлікту ў Інфлянтах.

Маскоўскія палітыкі любыя праявы мірных ініцыятыў без відавочных на тое прычын (і асабліва пры пагаршэнні двухбаковых стасункаў і пагрозе вайны) успрымалі як праяву няўпэўненасці і слабасці. Прыкладам, ініцыятыву польнага гетмана, троцкага кашталяна Рыгора Хадкевіча па навядзенню мастоў з маскоўскімі ўладамі праз дэрпцкага ваяводу Івана Фёдарава ўвосень 1562 г. Крэмль успрыняў як магчымасць пацягнуць час, пусціць пыл у вочы зацікаўленнем да мірных прапаноў і… належна

[17] Маскоўская крыніца сцвярджае, што гэтая ідэя была прапанаваная з санкцыі Жыгімонта Аўгуста: Тамсама. Т. 71: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. Т. III: 1561–1571 гг. / Ред. Г. Ф. Карпов. СПб., 1892. С. 18. Літоўская справаздача аб пасольстве Сукіна гэта не пацвярджае: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску, ф. КМФ-18, воп. 1, адз. зах. 605.

[18] СИРИО. Т. 71. С. 19.

падрыхтавацца да маштабнай ваеннай кампаніі супраць Полацка[19].

Варта бліжэй спыніцца на ініцыятыве Р. Хадкевіча, бо яна мае сама па сабе ўнікальны характар. Відавочна, што гетман самастойна прыняў рашэнне наладзіць кантакт праз высланне лістоў да дэрпцкага ваяводы. Таму гэта была не проста нефармальная, але і прыватная ініцыятыва. Толькі потым, пасля яго наладжвання і абмену канструктыўнымі прапановамі, аб гэтым сталі пастаўленыя ў вядомасць першыя радныя паны на чале з М. Радзівілам Чорным. Заўважым, на той час Жыгімонт Аўгуст ужо ад'ехаў у Польшчу дзеля ўдзелу ў Пётракаўскім сойме. Ідэя гэтага ліставання была адна – спыніць крывяпраліццё і дасягнуць міру паміж манархамі. Яго вынікам стала адпраўка ў лістападзе 1562 г. у Маскву ганца ад радных паноў (ад віленскага біскупа і канцлера) Сямёна Аляксеева[20]. Дарэчы, можна сцвярджаць, што гэтая ініцыятыва рабілася без згоды Жыгімонта Аўгуста, што само па сабе цікава. Аднак пасля візіту да мітрапаліта і баяр, які скончыўся ўжо 30 лістапада, літоўскага ганца адправілі не назад у Вільню, а спачатку у Цвер, потым у Пскоў і Дэрпт[21]. Толькі 20 студзеня ён быў адпушчаны на літоўскую тэрыторыю – напярэдадні ўступлення маскоўскага войска ў межы ВКЛ[22]. У гэтым вельмі паказальна праглядаюцца адносіны маскоўскай улады да дыпламатычных ініцыятыў літоўскіх магнатаў – яны з «сур'ёзнасцю» браліся пад увагу толькі пры патрэбе зацягнуць час альбо пры неспрыяльных для сябе ваенных і міжнародных абставінах. Такім чынам, восеньскія кантакты радных паноў у 1562 г. аказаліся сур'ёзным дыпламатычным пралікам, які толькі чарговы раз засведчыў слабасць пацыфісцкай пазіцыі літоўскага боку на міжнароднай арэне.

Цікава, што пасля сканчэння перамірнага тэрміну і разгортвання сапраўднай вайны пасля страты Полацка бакі не звярталіся на дапамогу да сродкаў нефармальнай камунікацыі, па-за малымі выключэннямі. Чым гэта было абумоўлена? Перадусім, моцным павялічэннем дыстанцыі ў камунікацыі, выкліканым ваенным становішчам. Гэта накладвала адбітак і на культуру зносін. Прыкладам, маскоўцы, атрымаўшы перамогу пад Полацкам у 1563 г., верхаводзілі ў перамовах з пазіцыі сілы, а літвіны, каб захаваць гонар, не прыніжаліся да просьбаў аб міры. Нефармальныя кантакты былі спынены літвінамі па дзвюх магчымых прычынах: ці то

[19] Гл.: Тамсама. С. 68–88.

[20] Тамсама. С. 88–115.

[21] Тамсама С. 99, 115–116.

[22] Тамсама. С. 120.

разумеючы бяссэнсоўнасць завіханняў наконт замірэння ў варунках вайны (хаця пацыфісцкая пазіцыя большасці з магнацкай вярхушкі ВКЛ нікуды не падзелася), ці то набраўшыся досведу з няўдалых кантактаў з маскоўцамі на пачатку 1560-х гг.

Праўда, адразу пасля захопу Полацка паны-рада былі вымушаны пайсці на кантакты з маскоўцамі, каб атрымаць паўзу ў ваенных дзеяннях[23]. Потым, на працягу 1563 г., кіраўніцтва ВКЛ некалькі разоў прасіла перасунуць тэрмін сканчэння перамір'я, каб выслаць пасольства. Кожны раз маскоўскія ўлады, так бы мовіць, «сыходзілі» да такой просьбы, хоць ва ўласных інтарэсах таксама было мець мір на кароткі час. У гэтым праяўлялася культурна-стэрэатыпная ўстаноўка, уласцівая дыпламатычным зносінам тагачасся: калі ты меў моцную пазіцыю, то мог дыктаваць сваю волю альбо з вышыні пагаджацца на просьбы іншага боку, асабліва калі гэта супадала з уласным інтарэсам.

У гэтым рэчышчы цікава выглядае справа, калі звярнуцца да праблемы ўтрымання і абмену палонных. Яны выступалі своеасаблівай разменнай манетай у дыпламатычным гандлі. Наяўнасць знатных асоб у палоне рабілася важкім чыннікам ціску на дыпламатаў у ваенных абставінах. У абавязкі астатніх уваходзіла зацікаўленне станам утрымання і здароўя палонных, абмеркаванне пытанняў аб выкупе альбо абмене, перадача звестак ад родных і на радзіму і г.д.  Гэтая акалічнасць старанна выкарыстоўвалася, што добра відаць на прыкладзе Інфлянцкай вайны.

Першая згадка пра літоўскіх палонных у маскоўскіх пасольскіх кнігах датычыцца 8 верасня 1563 г. У гэты дзень адбылася сустрэча літоўскага гаспадарскага ганца Васіля Мацкевіча з найбольш важнымі палоннымі, якія апынуліся ў маскоўскім зняволенні пасля захопу Полацка – ваяводай Станіславам Давойнай, віленскім ваяводзічам Янам Глябовічам, а таксама мяшчанамі Яцкам Быстрэйскім і Васілём Сялявай. Ключавым момантам сустрэчы стала перадача ліста Давойны да гаспадара, у  якім той сцвярджаў, што ў турме з палоннымі абыходзяцца гуманна і з пашанай. Такі інфармацыйны пасыл павінен быў адлюстраваць высакароднае стаўленне Івана IV  да абаронцаў Полацка, іх лаяльнасць у дачыненні да маскоўскіх уладаў з гледзішча свайго дастойнага ўтрымання. Недарма палонныя заявілі: «здесе есмя государевым царя и великого князя жало-

[23] Тамсама. С. 121–123. 20 лютага 1563 г., праз 6 дзён пасля падзення Полацка, у ваенны лагер маскоўцаў быў накіраваны ганец Павел Беражыцкі з лістом ад радных паноў канцлера і віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла Чорнага, найвышэйшага гетмана, троцкага ваяводы М. Радзівіла Рудога і польнага гетмана, троцкага кашталяна Рыгора Хадкевіча.

ваньем довольны»[24]. Апрача таго, Давойна «пацвердзіў», што Полацк быў узяты Іванам Грозным «огнем и мечом».

Такім чынам, маскоўскія палітыкі стваралі адпаведны фон для далейшых перамоў, пры якім літвіны не маглі абвінаваціць адваротны бок у нечалавечым, зняважлівым стаўленні да спалоненых палачан, а таксама ўсумніцца ў сапраўдным поспеху аблогавай аперацыі супраць Полацка. Дарэчы, у далейшым часе маскоўцы выхваляліся, як добра ўтрымліваюць палонных, насуперак літоўскаму антыгуманнаму захаванню.

17 снежня 1563 г., падчас знаходжання ў Маскве літоўскага пасольства, адзін з паслоў – Міхайла Гарабурда – папрасіў цара ўбачыцца са зняволеным братам Лукашам, нават без размовы з ім. Маскоўскі бок арганізаваў публічную сустрэчу, пры гэтым было заяўлена, што ў сувязі з неканструктыўнай пазіцыяй пасольства і літоўскага гаспадара ўмовы ўтрымання палонных могуць быць пагоршаныя[25]. Безумоўна, гэтая сустрэча пераследавала палітычныя мэты: палонныя выступалі новым сродкам дыпламатычнага ціску і, адначасова, гэта была дэманстрацыя трыумфу маскоўскай зброі. І хаця сустрэча, якая адбылася 21 снежня 1563 г., насіла больш прыватны характар, чым палітычны, усё-такі яна мела важнае палітычнае значэнне. Па-першае, палонныя звярнуліся праз паслоў да Жыгімонта Аўгуста з просьбай не забыцца пра іх, па-другое, яны зноў пацвердзілі, што маскоўцы ўзялі Полацк «агнём і мячом», што прагучала дысанансам у дачыненні да пасольскіх слоў пра нечаканы і вераломны характар полацкай кампаніі 1563 г.[26] Такім чынам, добра відаць, як палонныя ператвараліся ў важны чыннік палітычнай гульні паміж ваюючымі бакамі.

Крыніцы захавалі сведчанні аб элементарным, але ўсё-такі спецыфічным для дыпламатычных зносін прыёме навязаць нефармальныя кантакты з пасламі і здабыць патрэбную каштоўную інфармацыю. Гаворка ідзе пра працяглыя піры і застоллі, дзе, зразумела, спіртныя напоі цяклі ракою. Прыкладам, літоўскі пасол, віцебскі ваявода С. Збаражскі, які пабываў у Маскве на пачатку 1556 г., адзначаў у сваім пасольскім дзённіку, як пасля прыёму ў цара ў рэзідэнцыю да паслоў прыехалі маскоўскія прыставы Сямён Чэлядзін і Карп Сытнік «честовати» ад імя цара. У выніку «чтили

[24] Тамсама. С. 168–169.

[25] Тамсама. С. 281–282.

[26] У адказ на просьбу палонных паслы заявілі: «А вы ныне будте в терпливости, а мы вашу трудность до государя своего милостивого краля донесем и до его рады и ваше челобитье будет донести» (Тамсама. С. 286–287).

они нас час немалыи, а иж есмо пити не хотели, они ехали от нас проч»[27]. Гэтая фраза недвухсэнсоўна намякае, якім спосабам маскоўцы спрабавалі наладзіць кантакт з паслами.

Візіты на пасольскі двор часта выкарыстоўваліся пры неабходнасці навязвання кантакту. У чэрвені 1566 г., не маючы дакладных звестак пра пазіцыю літоўскага боку, Іван Грозны загадаў прыставам Фаме Траццякову і Раману Алфер'еву паслоў «почасту навещати того для, чтоб от них которое слово явилося, приказали б о чем к бояром»[28].

Для высвятлення пазіцый адваротнага боку прыбягалі і да такога спосабу, як даверлівыя размовы прыставаў падчас падарожжа дыпламатаў. Цікаўная гісторыя адбылася 10 жніўня 1565 г., калі літвіны прадпрынялі спробу наладзіць кантакты з маскоўскім бокам пасля даволі працяглага перапынку, які быў выкліканы разгромам маскоўцаў у Вульскай бітве 26 студзеня 1564 г. Зразумела, што падчас сур'ёзнага ваеннага супрацьстаяння ў маскоўцаў паўстала задача даведацца, з якімі ж намерамі літоўскі бок імкнецца наладзіць новы кантакт. Па дарозе ў Маскву маскоўскі прыстаў Казарын Трэгубаў уступіў у дыялог з літоўскім ганцом Ленартам Узлоўскім[29]:

«– Кое им (літвінам – *А.Я.*) лутче: воевать ли ся с московскими людьми, или в миру жити?

– Пане дей Казарин, коя земля богатеет, коя ся воюет?

– То нам лутче, что мы ся воюем; воинским людем ты емлешь пенези, а я в те поры у государя честен и пожалован[30].

– Может дей нас Бог питать и без того; а тому ся чему радовать, что меж нами христьянская кровь льетца? Вы дей хрестьяне, мы христьяне, ведь трошкою у нас вера розошлася, а едина наша вера в Троицу».

Гэтая размова раскрывае ідэйныя ўстаноўкі і прынцыпы знешнепалітычнага дзеяння, канцэптуальныя асновы паводзін у двухбаковых кантактах. Калі літвіны галоўны націск кладуць на міралюбнасці сваіх намераў, патрэбе дасягнення міру з увагі прыналежнасць да хрысціянскага свету, то маскоўскі прыстаў сцвярджае, што для «ваенных людзей» вайна з'яўляецца найлепшым часам для ўзбагачэння, узнагароджвання і прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Звернем увагу на рытарычнае пытанне ў адказ літоўскага ганца, за якім крыецца сэнс, што вайна даводзіць дзяр-

27 Сборник князя Оболенского. Кн. 5. С. 11.

28 СИРИО. Т. 71. С. 377.

29 Тамсама. С. 305.

30 У крыніцы ідзе ўдакладненне: «яз ему молвил по твоему государеву приказу», г.зн. па загаду Івана Грознага (Тамсама).

жаву і грамадства да збяднення і ўсеахопнага крызісу. У гэтым праглядаецца адна з найважнейшых матывацый, якая рухала кіроўнымі коламі ВКЛ на дыпламатычнай арэне ў пацыфісцкім накірунку – недахоп сродкаў у скарбе, гаспадарчы крызіс і падатковая неплацежаздольнасць значнай колькасці жыхароў Княства. Яшчэ адзін важны момант – акцэнтаванне ўвагі на рэлігійным адзінстве абедзвюх краін. Гэтая аргументацыя ляжала ў падмурку ідэі мірнага суіснавання абедзвюх дзяржаў, якая шырока выкарыстоўвалася як літвінамі, так і маскоўцамі. Рэлігійная афарбоўка апраўдання і абгрунтавання ўласнай знешняй палітыкі з'яўлялася неад'емнай рысай дыпламатыі ў перыяд сярэднявечча і ранняга Новага часу. Рацыянальныя тлумачэнні мелі, так бы мовіць, тэхнічны характар і знаходзіліся ў рамках дыпламатычнай палемікі заўсёды на другасным плане. У гэтым пытанні ёсць і іншы бок – мір выступаў безагаворачнай маральнай каштоўнасцю, у адрозненне ад вайны, таму міралюбныя намеры так ці інакш былі трактаваныя як пазітыўная з'ява ў дыпламатычных зносінах.

Выказаная нефармальным чынам пазіцыя Л. Узлоўскага як афіцыйнага прадстаўніка ВКЛ выявіла імкненне літоўскага боку да перамоў дзеля пошуку кампрамісу і няхай часовага замірэння. Для маскоўцаў гэта было немалаважным сігналам, бо дазваляла пабудаваць тактыку паводзін на перамовах з улікам сітуацыі, трымаючы ініцыятыву наконт згоды на перамір'е ў сваіх руках, бо ж аб ім «прасілі» літвіны. Як ужо казалася вышэй, гэта дазваляла пабудаваць перамоўны працэс з пазіцыі сілы, дыктуючы уласныя варункі.

З шэрагу падзей, звязаных з нефармальнай камунікацыяй і кулуарнымі дыпламатычнымі захадамі, варта згадаць місію ў Маскву літоўскага ганца Улана Букрабы, якая адбылася ўвосень 1568 г. Ганец быў адпраўлены ў Маскву за глейтавымі лістамі («опасными грамотами»), каб наладзіць чарговы раўнд перамоў.

Увесь ход знаходжання У. Букрабы ў межах Маскоўскай дзяржавы павінен быў паказваць мірныя намеры літвінаў. У рапартах маскоўскіх ураднікаў, запісаных у пасольскую кнігу, паведамляецца пра ўпрошванне літвінамі гаспадара заключыць мір[31]. Мяркуем, што гэта быў стары тактычны ход – паказаць мірныя намеры літвінаў у супрацьвагу агрэсіўным польскім, каб тым самым павялічыць шанцы на ўдалы зыход дыпламатычнай місіі.

[31] «Упросили Литва у короля, чтоб послал посланца к государю к московскому о том, чтоб велел послом итти к себе о миру» (Тамсама. С. 573).

На гэта былі, безумоўна, скіраваныя і словы ганца пра адсутнасць на межах літоўскага войска. У. Букраба ў прыватнай размове з маскоўскім приставам Афанасіем Біцягоўскім паведаміў, што найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч стаіць у Менску са сваім дваром[32], да польнага гетмана Р. Сангушкі, які знаходзіўся ў Бельмаках паблізу Чашнікаў, было накіравана 2 тыс. найманых жаўнераў. Акрамя таго, у Уле, дзе адбывалася аднаўленне замку, стаялі рота Станіслава Тарноўскага і перадыслакаваная з Віцебска казацкая рота Сямёна Бірулі[33].

Такая ацэнка арганізацыі абароны недалёка адыходзіла ад сапраўднага стану рэчаў. Таму на першы погляд перадача маскоўцам інфармацыі пра ненайлепшае вайсковае забеспячэнне мае дзіўнаваты характар. Хто ж паведамляе непрыяцелю пра ўласную непадрыхтаванасць да абароны і адпору варожага нападзення? Аднак гэта мела сваю логіку ў тым, каб паказаць адсутнасць намераў ваяваць. Заўважым, праўда, што нават паведамленне пра дзве тысячы наймітаў прыводзіла маскоўцаў у спалох і прымушала іх думаць аб агрэсіўных планах літвінаў[34].

Самым інтрыгуючым момантам місіі У. Букрабы стала вітанне Івана IV як «великого князя всеа Руси»[35]. На здзіўленыя запытанні маскоўскіх дыпламатаў літоўскі ганец адказаў, што «ему приказали царское имя говорити от короля радные паны» (падкрэслена намі – *А.Я.*), якія адпраўлялі яго ў Маскву. Царскі тытул не быў запісаны ў гаспадарскай грамаце, зразумела, каб не пакінуць маскоўцам прэцэдэнту для далейшага ціску ў дыпламатычных зносінах. Цалкам верагодна, што тут мы маем справу з гульнёй радных паноў ад уласнага імя, падчас якой яны мелі больш прасторы для манеўру, у тым ліку з выкарыстаннем царскага тытулу. На нашу думку, на гэта яны мелі маўклівую згоду Жыгімонта Аўгуста.

Гісторыя са згадваннем царскага тытула яскрава паказвае, што для кіроўных элітаў ВКЛ іменаванне Івана Грознага рускім царом у нефармальнай форме не мела абсалютна прынцыповага значэння. Пры неабходнасці гэтая прыманка магла быць кінута маскоўскім палітыкам дзеля дасягнення пэўнай палітычнай мэты. У канцы 1568 г. такой мэтай было спыненне ваенных дзеянняў. Стабілізацыя на ваенным фронце была патрэбна для склікання супольнага польска-літоўскага сойма, на якім прадугледжвала-

[32] Пацвярджэнне гэтаму гл.: Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie / Wyd. B. Gorczak i Z. Luba-Radzimiński. T. VII. Lwów, 1910. S. 292–295.

[33] СИРИО. Т. 71. С. 573, асабліва 575.

[34] Гл. ліст Ф. Кміты да Р. Хадкевіча ад 3 лістапада 1568 г.: Biblioteka Polskiej Akademii Nauk w Kórniku, rkps 1536, k. 385–386.

[35] СИРИО. Т. 71. С. 578.

ся заключэнне міждзяржаўнай уніі.

Падводзячы вынікі, варта яшчэ раз звярнуць увагу на вялікае значэнне нефармальных кантактаў у дыпламатычных зносінах паміж ВКЛ (Рэчай Паспалітай) і Маскоўскай дзяржавай у XVI ст. Для самога перамоўнага працэсу нефармальныя кантакты часта рабіліся тым вызначальным чыннікам, які дазваляў прыйсці да прыймальнага для ўсіх бакоў рашэння альбо хаця б высвятліць сутнасць пазіцый супрацьлеглага боку. Для сучасных даследчыкаў жа звесткі аб нефармальнай камунікацыі становяцца той неацэннай крыніцай ведаў, дзякуючы якой мы атрымліваем магчымасць спазнаць сапраўдныя механізмы дыпламатыі перыяду ранняга Новага часу ў ВКЛ.